Сенненская зямля багатая на цікавых людзей

*да 100-годдзя А.Вялюгіна*

З чаго пачынаецца паэзія? Вядома ж, з матчынай песні, ад бацькоўскага парога, з маленства. І, зразумела, трэба гаварыць пра чалавечы характар – перш за ўсё пра яго вытокі…



*Ён сын прыгожай сенненскай зямлі,*
*Ён сын яе палёў, лугоў, азёраў,*
*Крыніц і ясных, сонечных прастораў,*
*Шляхоў, што ў далі светлыя вялі.*

*Паэт лавіў жыцця няспынны рух,*
*Знаходзіў у ім і радасць, і натхненне.*
*І адчуваў у душы задавальненне,*
*І ведаў, што не згасне веры дух.*

*Радкамі вершаў нёс дабро ў свет,*
*Любіў і шанаваў сваю Радзіму.*
*І жыў заўсёды з ёй жыццём адзіным,*
*Каб на зямлі пакінуць добры след.*

*Лаыса Гапеева*

27 снежня 2023 года спаўняецца 100 год з дня нараджэння нашага славутага земляка, паэта, перакладчыка, кінадраматурга Анатоля Сцяпанавіча Вялюгіна.

Заслужаны дзеяч культуры нарадзіўся ў в. Машканы Сенненскага раёна. Пра сваё дзяцінства паэт успамінаў: *“Машканы, Івоні, Ракіты, хутар Кляпчэва – авеяныя лесавым шумам мацерыкі майго маленства”.* На хутары і прайшла значная частка маленства паэта. У Івонях і Машканах жыла сям’я бацьку, вясковаму фельчару, даводзілася пераязжаць з месца на месца. Калі сям’я падалася на заробкі ў Данбас, маленькі Анатоль застаўся ў



бабулі на хутары Кляпчэва. Гадавала яго цётка Анюта – лесавічка, касец і малацьбіт, добры знаўца лекавых траў.

Дзед Анатоля Вялюгіна меў прозвішча Вялюга. Пасля яго смерці, «забрываючы» ў салдаты бацьку будучага паэта, прыстаў змяніў канчатак, дадаўшы адну літару. Так з'явіліся Вялюгіны. Бацька, Сцяпан Цярэшкавіч Вялюгін, перад самай рэвалюцыяй быў мабілізаваны на Балтыйскі флот, дзе скончыў ваенна-фельчарскую школу. Вярнуўшыся з грамадзянскай вайны, працаваў вясковым фельчарам. Маці, Мар'я Васілеўна Пракаповіч, была адукаваным для свайго часу чалавекам, вучылася ў гімназіі, была настаўніцай. У час калектывізацыі стала адным з арганізатараў і членаў праўлення калгаса. У сям'і паважалі кнігу, чыталіся навінкі беларускай, рускай, украінскай літаратур.

## *А. Вялюгін з роднымі*



*На здымку злева направа сястра Людміла, бацька Сцяпан Вялюгін і Анатоль*

Яшчэ ў школьныя гады А. Вялюгін быў дэлегатам Усебеларускага з'езда дзяткораў. Дасылаў допісы ў часопіс «Іскры Ільіча», у газеты «Піянер Беларусі» і «Віцебскі рабочы». Пасля сканчэння Машканскай сямігодкі залічаны на чацвёрты курс рабфака ў Віцебску (1938). У 1939-1941 працаваў у рэдакцыях газет «Піянер Беларусі», «Звязда», «Чырвоная змена».



*Анатоль Вялюгін у дзяцінстве*

Адначасова вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута. У тыя гады там займаліся таксама М. Аўрамчык, М. Барсток, Р. Бярозкін, Іван Грамовіч, В. Івашын, Я. Казека, А. Коршак, Мікола Лупсякоў, Я. Непачаловіч, Я. Семяжон і інш.

У 1939- 1941гг. працаваў у рэдакцыях газет “Піянер Беларусі”, ”Звязда”, ”Чырвоная змена”. Адначасова вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага. У 1940г. Анатоль Вялюгін прайшоў курс кінематаграфічнага майстэрства пад кіраўніцтвам А.П. Даўжэнкі на сцэнарным факультэце інстытута кінематаграфіі ў Маскве. З верасня некалькі месяцаў вучыўся ў Свярдлоўскім педагагічным інстытуце.

З верасня 1941 Анатоль Вялюгін студэнт Свярдлоўскага педінстытута. У 1942 прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны ў Луганскую авіяшколу, пасля ўдзельнічаў у баях на Сталінградскім фронце. У 1943 быў паранены і доўгі час знаходзіўся ў шпіталі.Узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны 1 ступені У 1943-1944 культмасавік заўкама на прадпрыемстве ў Свярдлоўскай вобл..

У маі 1945г. Вялюгін вярнуўся ў Мінск і пачаў працаваць у рэдакцыі газеты “Літаратура і мастацтва”. У 1948г. скончыў завочна Мінскі педагагічны інстытут імя М.Горкага. У перыяд з 1946 па 1984 з невялікімі перапынкамі быў рэдактарам аддзела паэзіі часопіса “Полымя”. У 1946г. стаў членам саюза пісьменнікаў Беларусі.



Яшчэ ў школьныя гады А. Вялюгін быў сельскім карэспандэнтам і дасылаў свае артыкулы ў розныя перыядычныя выданні. Першым сур’ёзным мастацкім творам паэта лічыцца верш “Матчына песня”(1938), які быў надрукаваны ў часопісе “Полымя рэвалюцыі”. У першыя пасляваенныя гады пад рознымі псеўданімамі - Яўген Бязмен, Кузьма Гіра – Анатоль Сцяпанавіч часта друкаваў вясёлыя раешнікі, вострыя літаратурныя фельетоны, дасціпныя эпіграмы і каламбуры. Потым выйшлі зборнікі паэта “Салют у Мінску” (1947), “Негарэльская арка”(1949), “На подступах”(1952), “На зоры займае” (1958), “Насцеж” (1960),” “Адрас любві”(1964), “Верасовы ўзятак” (1974), “Песня зялёнага



дуба” (1989), “З белага камення – сіняе пламенне” (1993) і інш.

Лірыка Вялюгіна - сапраўднае дасягненне беларускай паэзіі. Яго творчасці ўласцівы яркая метафарычнасць, асыцыятыўная вобразнасць, філігранная апрацоўка слова. У паэзіі А. Вялюгіна – шчырае апяванне роднай зямлі, пранікнёная споведзь паэта- франтавіка, які прайшоў суровыя выпрабаванні ваеннага ліхалецця. Асабліва яскрава праявілася паэтычнае майстэрства А. Вялюгіна ў паэме “Вецер з Волгі”, прысвечаная дзіцячым гадам У.І. Леніна. Гэты твор, нягледзячы на тое, што змяніліся погляды на вызначальныя вехі гісторыі, не страчвае сваёй эстэтычнай значнасці, з’яўляецца сапраўдным узорам дасканаласці і выверannасці мастацкага радка.




Некалькі зборнікаў вершаў напісаў паэт і для дзетак: “Галубы” (1949),”Тры гудкі” (1951), “Рыбы нашых рэк” (1952), “Дзіцячы сад” (1954), “Вада і вуда” (1967).

З незабыўнай Машканскай школы, якая дарэчы адзіная ў Беларусі, вывучыла і выхавала 4-х Герояў Савецкага Саюза: Машэрава Пятра Міронавіча, Гараўца Аляксандра Канстанцінавіча, Камінскага Івана Іларыёнавіча, Сарокіну Алену Дзям’янаўну прыйшла да Анатоля Вялюгіна “Бярозка”, каб нагадаць пра вытокі і карані:

Снягі і зоры за акном.
Заснулі ў хаце ўсе даўно.
Бярозка юная галлём
Паціху стукае ў акно.

А ты плывеш у белы свет...
Сінее плынь тваіх вачэй...
І найдалейшая з планет
Сяла суседняга бліжэй.

Стаіць задумная адна,
Як ветразь даўніх зім і лет.
Стаіць бярозка ля акна,
З якога мне адкрыўся свет.
...А я ўсё чую шум лясоў.
Шляхі ў маленства замяло.
І сніцца сон з найлепшых сноў:
Бярозкі дзіўнае святло.

Гэты верш быў пакладзены на музыку Ігара Лучанка і пасля чаго набыў небывалую папулярнасць. Песню "Бярозка", як талісман, узяў с собой у першы палёт беларускі касманаўт Пётр Клімук.

У сваёй перакладчыцкай дзейнасці Анатоль Вялюгін пераклаў на беларускую мову творы такіх паэтаў як М.Лермантаў, А. Міцкевіч, У. Маякоўскі, У. Сасюра, Л. Украінка, П. Нэруды і іншых аўтараў. Акрамя таго ён укладальнік і рэдактар "Анталогіі ўкраінскай савецкай паэзіі".

Шмат часу аддаваў А. Вялюгін рабоце ў кінематографе. Яму належаць сцэнарыі мастацкіх фільмаў "Рэха ў пушчы"(1977), "Глядзіце на траву"(1983). На кінастудыі "Беларусьфільм" паводле сцэнарыяў Вялюгіна знята 45 дакументальных фільмаў, 16 з якіх паўнаметражныя: "Арлінаая крыніца"(1966), "Генерал Пушчы" ( 1967), "Агонь" (1969),"Магілёў – дні і ночы мужнасці" ( 1974) і інш.

Не стала паэта 24 лістапада 1994 года. А апошняя яго кніга "Заклён на скругны вір" выйшла ў канцы 1995 года. У вершах, змешчаных ў гэтай кнізе, трывога аб тым, што адбываецца ў краіне, жаданне сказаць недасказанае, а ва ўсёй кнізе – прага жыцця.

Пройдуць гады, дзесяцігодзі, а паэзія Анатоля Сцяпанавіча Вялюгіна будзе гучаць не толькі на роднай зямлі, але і далёка за яе межамі. Яго творчасць – гэта творчасць, поўная любові і адданасці сваёй Бацькаўшчыне, свайму народу.

А мы – нашчадкі і землякі, будзем захоўваць спадчыну Анатоля Сцяпанавіча і ганарыцца славутым земляком.

Архіўныя матэрыялы і ўласная бібліятэка А. Вялюгіна захоўваюцца ў Цэнтры даследаванняў старадрукаў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

В.Фёдарава, бібліёграф Сенненскай цэнтральнай бібліятэкі ГУК "Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма "